**Музейны ўрок у 5 класе па тэме**
**“Традыцыйнае народнае жыллё”**

***Мэта ўрока*** : вывучэнне побыту беларускага народа, развіццё цікавасці да мінулага, да вытокаў і звычаяў сялянскай сям'і.

***Задачы ўрока:***

1.Адукацыйная: пазнаёміць вучняў з жыццём беларускіх сялян, іх працай, жыллём і адзеннем; вучыць дзяцей знаходзіць і апісваць прадметы побыту, даваць ім характарыстыку.

2.Развіваючая: фарміраваць уменні самастойна будаваць апавяданне на аснове розных крыніц інфармацыі, абагульняць асобныя факты; пашыраць кругагляд, развіваць цікавасць да беларускай народнай творчасці.

3.Выхаваўчая: выхоўваць цікавасць да беларускай народнай культуры, пачуццё павагі да тых людзей, якія стваралі розныя прадметы матэрыяльнай культуры, беражлівыя адносіны да беларускіх традыцый.

Тып урока: вывучэнне новага матэрыялу.
Форма урока: урок – экскурсія.
Абсталяванне: музейныя экспанаты, карткі з заданнямі, карткі з загадкамі.

**Ход урока.**

**1.Арганізацыйны мамент.**

***Настаўнік.*** Добры дзень, дзеці. Сёння ў нас з вамі незвычайны ўрок, так як ён праходзіць не ў традыцыйным класным пакоі, а ў нашым школьным музеі баявой і працоўнай славы. Спадзяюся, што ўрок вам прынясе задавальненне.

Чем дальше в будущее входим,
Тем больше прошлым дорожим,
И в старом красоту находим,
Хоть новому принадлежим.

**2. Пастаноўка мэты, задач.**

***Настаўнік***. Дзеці, звяніце ўвагу на экспанаты, якія вас акружаюць і паспрабуйце вызначыць тэму нашага ўрока.(Вучні мяркуюць аб чым будзе ісці гаворка на ўроку)

Так, мы будзем гаварыць аб сялянскай хаце, аб побыце сялян.

А як вы разумееце слова "побыт"?( Побыт - гэта паўсядзённае жыццё. )

А хто такія сяляне? (Сяляне - гэта людзі, якія жывуць у вёсцы.)

**3.Актуалізацыя ведаў**

- Што вы хацелі даведацца пра сялянскую хату і побыт сялян?
- З якой мэтай мы будзем вывучаць гэтую тэму?( адказы вучняў)

***Настаўнік.*** Мы працягваем наша знаёмства з народным побытам і культурнымі традыцыямі беларускага народа. Сёння мы з вамі пагаворым аб доме нашых продкаў. Тэма нашага занятку: "Традыцыйнае народнае жыллё". Мы даведаемся аб тым, як выбіралі нашы продкі месца для будучага свайго дома, як будавалі яго разам, як засцерагалі свой родны дом, як жылі проста і сціпла. Мы навучымся паважаць нашых прабабуль і прадзядуль за іх працу, дабрыню, уменне ствараць для свайго жыцця простыя і патрэбныя прадметы народнага побыту.

**4.Вывучэнне новага матэрыялу.**

План

1. Дом нашых продкаў.
2. Гісторыя сялянскай печы.
3. Прадметы народнага побыту.

***Насаўнік.*** У даўнія - даўнія часы вялізны свет акружаў нашых продкаў. Чалавек адчуваў сябе залежным ад сіл прыроды. Бо ў прыродзе былі і добрыя, і злыя духі. Імкнучыся абараніцца ад усяго небяспечнага, чалавек стварыў сабе прытулак - дом.

- Што такое дом у вашым разуменні?

***Дзеці***. Дом - гэта жыллё. Дом - гэта месца, дзе мы жывем усёй сям'ёй. Дом - гэта наша жыллё. Дом - гэта мая сям'я. Дом - гэта будынак для жылля і інш.

***Настаўнік***. Малайцы, дзеці. Вы правільна адказалі. Дом - гэта нешта вельмі роднае для нас, гэта наша жыллё. Тлумачальныя слоўнікі У.І.Даля і С.І.Ажогава, якія ўжо знаёмыя вам, так вызначаюць значэнне слова "дом": "Дом - гэта жылы будынак".

Нашым продкам многае трэба было ведаць, каб пабудаваць для сябе жыллё - дом. Перш за ўсё выбіралася добрае месца. Каб вада была побач, ды каб не ў нізіне, а то ўвесну затопіць, ды каб у хаце адчуваць сябе было добра. Доўга прыглядаліся - прыглядаліся продкі нашы да месца будучага дома: калі птушка часта садзіцца на зямлю, то і месца тут добрае. Або святло скрозь воблокі праб'ецца, значыць месца багамі пазначанае, можна хату ставіць. І першае, што трэба было зрабіць - гэта абараніць месца будучай хаты ад нядобрых сіл, таму яго апахівалі вакол па крузе, гэта знак неба і сонцы, гэта абярэг.

***Настаўнік***. З паняццем "абярэг" мы з вамі ўжо сустракаліся. Давайце паглядзім на прадметы нашага музея "Даматканае адзенне нашых бабуль і дзядуль" і знойдзем тут абярэгі.

(Дзеці паказваюць абярэгі на беларускіх народных кашулях).

***Настаўнік***. Малайцы, дзеці. Памятайце тое, што мы раней вывучалі з вамі. Дайце, калі ласка, вызначэнне слову "абярэг".

***Дзеці.*** Абярэг - гэта талісман. Гэта абарона ад нядобрых сіл.

***Настаўнік***. Сёння мы з вамі даведаемся, якія абярэгі абаранялі дом нашых продкаў. Вось агарадзілі месца будучага дома нашы продкі, а потым у цэнтр будучага дома ўкопвалі дрэва. Як вы думаеце, якое дрэва?

***Дзеці***. Вядома ж, бярозу.

***Настаўнік***. Менавіта бярозу нашы продкі называлі ласкава Берагіняй. Калі іконы на зямлі нашай зацвердзіліся, сталі людзі на бярозу ікону вешаць, каб берагла таксама будучую хату. Камяні вялікія з чатырох канцоў свету прывозілі, каб дом моцна стаяў. Ды дрэвы моцныя (елка, хвоя) нарыхтоўвалі на новую хату.

***Настаўнік***. А зараз, я запрашаю вас да нашага этнаграфічнага вугалка. Тут вы можаце бачыць шматлікія прадметы быту, якімі карысталіся вашы прабабулі і прадзядулі. Уважліва разглядзіце іх і выберыце сабе прадмет народнага побыту, каб потым пра яго расказаць. А спачатку вызначыце, якія прадметы народнага побыту з верша Л.А.Мея тут ёсць, назавіце іх.

В низенькой светелке, со створчатым окном,
Светится лампадка в сумраке ночном.
Новая светелка чисто прибрана:
В темноте белеет занавесь окна,
Пол отструган гладко, ровен потолок,
Печка развальная встала в уголок.
У стены укладка с дедовским добром,
Узкая скамейка, крытая ковром,
Крашеные пяльцы со стулом раздвижным
И кровать резная с пологом цветным.

(Дзеці называюць прадметы).

***Настаўнік***. Малайцы, дзеці. Вы правільна назвалі прадметы народнага побыту. Мы працягваем нашае знаёмства з домам нашых продкаў. Як вы думаеце, што даўней было самым галоўным у хаце?(здагадкі дзяцей)

***Дзеці***. Печ.

***Настаўнік***. Правільна, сапраўды так. А што вы можаце расказаць аб печы?

***Вучань.*** Раней не існавала такой хаты, у якой не было бы рускай печы. Руская печ - гэта ўнікальны прадмет ва ўсходнеславянскай культуры і самы яркі сімвал рускага духу. Першыя збудаванні для апальвання хат, якія сталі правобразамі цяперашніх рускіх печаў, з'явіліся каля чатырох тысяч гадоў назад. Людзі зразумелі, што агонь, які яны захоўваюць, можна схаваць пад дах. Аж да VIII стагоддзя печы былі без трубы, таму ўвесь дым выходзіў праз дзверы, з-за гэтага на столі і сценах хаты назапашваліся пласты сажы. Крыху пазней над печамі збудавалі адтуліны ў даху і паставілі драўляныя трубаправоды. Затым у XVIII стагоддзі сталі ўжываць вогнетрывалую цэглу і ў печы з'явілася цагляная труба, якая ўзвышалася над хатай. Таму можна сцвярджаць, што ўпершыню класічная руская печ з'явілася менавіта ў XVIII стагоддзі.

Печ павінна была выконваць некалькі галоўных задач - гэта апальванне памяшкання і падрыхтоўка ежы. Для раўнамернага апальвання ўсіх памяшканняў яна ўсталёўвалася ў цэнтры хаты, каб праз змешчаныя па блізкасці вокны і дзверы не выцягвалася цеплыня.

Печы вялікіх памераў выкарыстоўваліся ў якасці лазні. Пасля таго як яе распальвалі, месца, куды ўкладваліся дровы, старанна вычышчалі і засцілалі

саломай. Далей туды ставілі чыгуны з вадой і можна было прымаць водныя працэдуры. Дарослыя купаліся самастойна, а дзяцей змяшчалі ўнутр на спецыяльнай лапаце.

І вядома ж на печы адпачывалі і спалі. Месца для сну называлі палацці, іншымі словамі, гэта былі паліцы, на якіх спалі. Яны ўсталёўваліся паміж сцяной і печчу. Месцы для сну будаваліся ў два ярусы. На першым ярусе найчасцей спалі дарослыя, а на другім дзеці. На паліцах умяшчалася да шасці чалавек.

Рускую печ па праву можна назваць асновай традыцыйнага сялянскага побыту.

***Настаўнік.*** Я бачу, што вам не церпіцца расказаць пра прадметы народнага побыту, якія вы выбралі. Калі ласка, пачынайце свой аповед.
(Дзеці расказваюць аб прадметах быту беларускіх сялян).

***Вучань1***. **Калаўрот** (самапралка) – прылада для механізаванага прадзення лёну і воўны ў хатніх умовах. У Беларусі вядомыя два асноўныя тыпы калаўротаў: стаяк, характэрны для заходніх зямель, і ляжак, характэрны для паўночных і паўночна-ўсходніх зямель. Абодва тыпы мелі аднолькавыя рабочыя часткі: кола, педаль, якой кола прыводзілася ў рух і прадзільны апарат. Апошні складаўся са стрыжня і размешчанай на ім шпулькі для намотвання пражы і маленькіх калёсікаў, злучаных пры дапамозе шнуроў з вялікім колам. У калаўроце-стаяку кола знаходзілася паміж двюмя вертыкальнымі стойкамі над прадзільным апаратам. Калаўроты з’явіліся ў Беларусі ў 16 ст. на мануфактурных прадпрыемствах, у сялянскім побыце з сярэдзіны 19 ст., асабліва ў раёнах інтэнсіўнага льнаводства – поўнач і ўсход Беларусі ,на паўднёвай Беларусі пераважала прадзенне з дапамогаю верацяна.

***Вучань2***. **Прас** — прылада для разгладжвання складак на тканіне. У XVIII—XIX стагоддзях прасы ўяўлял і сабой металічныя збудаванні формы, блізкай да сучаснай. Гэта былі прасы, якія напаўняліся вуглямі з печы (прас з жарам, вугальны прас). Трэба было раз-пораз размахваць прасам, каб вуглі разгараліся і грэлі корпус праса. Прасавалі бялізну асцярожна, калі вуглі перагравалі корпус праса, можна было спаліць тканіну. Такія прасы выкарыстоўвалі ў асноўным для прасавання тканін з ільну, бавоўны, сукна. Прас пасля прасавання патрабавалася чысціць ад вуглеў.

***Вучань3***. **Качалкі.** Для прасавання бялізны і вопраткі выкарыстўвалі таксама драўляныя прасы – качалкі (рубель). Бялізна наматвалася на качалку, пасля чаго некалькі разоў старанна пракатвалася «рубелем» – доўгай драўлянай плашкай з рэбрамі на ніжняй паверхні і ручкай на канцы. Рубель з характэрным стукам перекатваў качалку, рэбры яго пры гэтым размінала валокна тканіны. Гэта прыстасаванне называлася таксама «рэбрак», «раскатка», «пральнік». Яно праіснавала ў вёсках некаторых рэгіёнаў да канца XX стагоддзя.

***Вучань 4***. **Маслабойка**, або бойка – бандарны выраб; у беларусаў - пасудзіна для збівання масла. Найчасцей – вузкая высокая кадачка з клёпак. У накрыўцы пасярэдзіне адтуліна для калатоўкі (біла), верхні канец якой

выходзіў вонкі, а да ніжняга прымацоўвалі кружок з дзіркамі (пашыраны варыянт) ці крыжавіну (ударная частка). Такой жа формы маслабойку выдзёўбвалі з суцэльнай круглай калодкі. На Палессі былі вядомы маслабойкі цыліндрычнай формы гарызантальнага профілю, у выглядзе 2-доннай бочачкі, у якой было «акенца» з засаўкай; масла збівалі вярчэннем ручкі, што прыводзіла ў рух лопасці.

***Вучань 5.*** **Ступа.** Традыцыйная прылада для апрацоўкі зерня на крупы. Выкарыстоўвалася і для іншых мэт. На Беларусі была пашырана ручная ступа. Ручную ступу рабілі з кавалка тоўстага ствала дуба, граба, часам таполі або ліпы вышынёю 110-120 см. У ствале выдзёўбвалі або вапальвалі конусападобную выемку глыбінёй 40-50см і дыяметрам у верхняй частцы 35-40 см. Зерне ў ступе таўклі таўкачом, тоўстай выструганай палкай з паўкруглымі канцамі, даўжыня якой дасягала 90-110 см; для зручнасці трымання ў сярэдняй яго частцы рабілі выемку. Часта таўклі ў два таўкачы. Зерне перад апрацоўкай сушылі, а ў працэсе таўчэння для таго, кааб лепш аддзялялася шалупінне, крыху змочвалі вадой.

***Вучань 6.*** **Серп.** Прылада для ўборкі збожжавых культур (жыта, ячменю, пшаніцы, проса, аўса і інш.). Вядомы з глыбокай старажытнасці (каменны, бронзавы вякі). Да канца 19 ст. сярпы рабілі з жалеза, якое выплаўлялі ў руднях з мясцовай балотнай руды, рэжучую частку зазубрывалі. На Беларусі паўсюдна бытавалі сярпы паўкруглыя (сферычныя) і падоўжаныя (авальныя). У авальных даўжыня ад пачатку ручкі да канца рэжучай часткі (клінок) па прамой лініі 40-43 см, шырыня ляза 2,5-3 см, разрэз насечкі зубоў прыкладна 2 мм, даўжыня драўлянай ручкі 13 см. Паўкруглы серп карацейшы: даўжыня ляза па прамой лініі 30-32 см. У наш час у калгасах і саўгасах збожжавыя культуры ўбіраюць камбайнамі. Сярпом нажынаюць першы ці апошні сноп.

***Вучань 7.*** **Верацяно.** Прылада для ручнога прадзення лёну, воўны, пянькі. У старажытныя часы верацяном служыла драўляная крыху завостраная палачка даўжынёй 20-30 см з завостраным верхам, патоўшчаным нізам, на які для павелічэння вагі надзявалі прасліца, і вострай пяткай. Верацяно выстругвалі нажом або выточвалі з бярозы, ясеню, грушы і інш. На вытачаных верацёнах дзеля зручнасці і як аздабленне наразалі кольцы-паглыбленні.

***Вучань 8.*****Драўляныя ночвы.** Карытападобная пасудзіна з шырокім адкрытым верхам. Прызначаліся для мыцця бялізны, прыгатавання сечанай капусты, якую ссыпалі затым у бочкі, мяса для каўбас і іншага. Рабілі з драўлянага цурбана (асіны, ліпы), колатага папалам; ёмістасць выдзёўбвалі цяслой, сценкі і дно знутры згладжвалі скобляй, разцом.

***Вучань 9.*** **Рэшата.** Прылада да прасейвання мукі ці правейвання зерня. Абечак рабілі звычайна з сухога лубу, дно – з рагожнай ці валасяной сеткі.

**Настаўнік**. Дзякуй, дзеці, вы так цікава расказалі пра прадметы народнага побыту. А загадкі пра дом і яго рэчы вы падрыхтавалі?

**Дзеці**. Так.

Дзеці загадваюць загадкі.

• Залезла Варвара вышэй свірана, не есць, не п'е, усё на неба глядзіць. (Труба на даху.)

• Маці тоўстая, дачка чырвоная, сын-сокал у воблакі сышоў. (Печка, агонь, дым.)
• Чатыры браткі пад адным шатром стаяць. (Стол.)
• Стаіць бычышча - пракляваныя бачышчы. (Хата.)
• Дар'я ды Мар'я глядзяцца, а не сыдуцца. (Столь і падлога.)
• Не жывыя, а пішчаць. (Вароты.)
• Па сенях ходзяць, а ў хату не заходзяць. (Дзверы.)
• Хвост у двары, нос у будцы, хто хвост паверне, той і ў хату ўвойдзе. (Ключ у замку.)
• Белая старуха на адным месцы сядзіць.(Печ)
• Чатыры браты гадамі роўныя, адзін галоўны. (Вуглы хаты)
• Без рук, без ног, а ў хату не пускае.( Замок)

***Настаўнік***. Малайцы, дзеці, вы цікавыя загадкі падрыхтавалі.

**5.Замацаванне новага матэрыялу.**

***Настаўнік***. Наш народ склаў шмат прыказак пра свой дом, сваё жыллё. Зараз я вам прапаную некалькі прыказак, а вы павінны правільна растлумачыць іх значэнне.

1. Чырвоная хата не кутамі, а пірагамі.
2. І сцены ў доме дапамагаюць.
3. Мой дом – мая крэпасць.

Вучні чытаюць прыказкі і тлумачаць іх сэнс.

**6. Падвядзенне вынікаў урока.**

***Настаўнік***. Жыллё чалавека - гэта не проста сцены, падлога і столь. Гэта частка чалавечага жыцця, паказчык унутранага стану чалавека, узроўня развіцця народа, нацыі. Менавіта ў жыллі адлюстроўваюцца традыцыі народа, яго светапогляд.

Але самае галоўнае: жыллё чалавека - гэтае месца, дзе мы жывем і развіваемся, адпачываем і працуем. Месца, дзе нас заўжды сустрэнуць, заўсёды падтрымаюць. Месца, куды заўжды хочацца вярнуцца.

**7.Рэфлексія.**

1. Прыём "Прадоўжы фразу".

Настаўнік просіць вучняў прадоўжыць фразу:

- Дом - гэта ...

2. Складанне сінквейну.

Вучні з дапамогай настаўніка складаюць сінквейн.

1. Тэма нашага занятку.(Быт)
2. Якім быў побыт сялян?(Просты, зручны)
3. Якія дзеянні здзяйсняюцца пры гэтым? (Гатаваць, вязаць, шыць)
4. Навошта мы гэта вывучаем?(Захаваць памяць аб мінулым)
5. Якім словам можна замяніць слова "побыт"? (Жыццё)

Быт
Просты, зручны
Гатаваць, вязаць, шыць
Захаваць памяць аб мінулым
Жыццё